**Водзыў**
**навуковага кіраўніка на дысертацыйнае даследаванне**
**Ненадаўца Ягора Аляксеевіча**
**"Водная прастора ў народных вераваннях беларусаў: семантыка, сімволіка, функцыянальнасць"**

Дысертацыйнае даследаванне "Водная прастора ў народных вераваннях беларусаў: семантыка, сімволіка, функцыянальнасць" – вынік шматгадовай працы Ягора Аляксеевіча Ненадаўца. Яно выконвалася ў рамках Дзяржаўных праграм фундаментальных даследаванняў нацыянальнай культуры Беларусі. Неабходна падкрэсліць, што дадзеная праца з'яўляецца першым спецыяльным комплексным даследаваннем. Дысертантам уведзены ў навуковы ўжытак фальклорныя і этнаграфічныя матэрыялы, што знаходзяцца ў айчынных архівах і лабараторыях. Упершыню ў беларускай фалькларыстыцы праведзена комплекснае даследаванне вобраза вады і воднай прасторы ў нацыянальнай міфалогіі і вуснапаэтычнай творчасці, што дазволіла разглядаць яго як неад'емную частку самабытнай традыцыйнай культуры, функцыянальна скіраваную на глыбокае асэнсаванне стыхійных праяў рэальнага свету. Цэласна ахарактарызаваны павер'і пра ваду ў шэрагу каляндарных і сямейных абрадаў, у замовах, казках, прыкметах і павер'ях, прыказках і прымаўках выяўлена іх семантычная напоўненасць: раскрыты дамінантныя прыметы, вызначана спецыфіка кампанентаў. Акрэслены сацыяльна-гістарычныя прычыны і напрамкі структурнай і змястоўнай трансфармацыі беларускіх абрадаў і жанраў фальклору, звязаных з вадой; выяўлены і прааналізаваны фальклорныя жанры ў складзе беларускіх абрадаў і сімвалічна-рытуальных дзеянняў, раскрыты адметнасці мастацкіх сродкаў вербальных тэкстаў беларускай народнай творчасці.

Навуковыя палажэнні, якія выносяцца на абарону, вывады працы маюць неабходную ступень навізны, абгрунтаваныя аналізам шырокага фактычнага матэрыяла: палявых фальклорных запісаў аўтара (2004-2023), матэрыялаў архіваў, уласных калекцый, літаратурных крыніц. Дакладнасць

вынікаў дысертацыі абумоўлена таксама выкарыстаннем сучаснай метадалогіі фалькларыстыкі.

Вынікі навуковага даследавання апублікаваны ў 10 артыкулах у навуковых выданнях, уключаных у Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў, у 1-й кнізе ў сааўтарстве, у 2-х раздзелах калектыўных манаграфій па культуры беларусаў і ў 13 іншых публікацыях.

Практычнае значэнне навуковай працы Я.А. Ненадаўца заключаецца ў выкарыстанні яго вынікаў у лекцыйных курсах "Беларуская мова. Прафесійная лексіка", "Беларуская мова і культура маўлення" у Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце. Вынікі дысертацыі могуць быць выкарыстаны ў дзейнасці музеяў, клубных установаў, бібліятэк, аграсядзіб, накіраванай на захаванне і папулярызацыю беларускай вуснапаэтычнай творчасці нашых продкаў.

Дысертацыя Ненадаўца Ягора Аляксеевіча "Водная прастора ў народных вераваннях беларусаў: семантыка, сімволіка, функцыянальнасць" з'яўляецца завершанай кваліфікаванай навуковай працай, якая змяшчае новыя навукова абгрунтаваныя вынікі, сукупнасць якіх мае важнае значэнне для развіцця фалькларыстычных даследаванняў культуры беларусаў. А яе аўтар заслугоўвае прысуджэння вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці "10.01.09 - фалькларыстыка".

Навуковы кіраўнік
акадэмік А.І. Лакотка

ПОДПИСЬ ... УДОСТОВЕРЯЮ
20 23 г.